# Піліпаўскія вячоркі

Вядучая

Добры дзень, паважаныя госці. У нас існуе добры звычай – вітаць гасцей хлебам, соллю, які падаюць на ручніку.

Мы звычай зямлі сваёй зберагаем,

Гасцей дарагіх хлебам - соллю вітаем!

(Кладзе хлеб – соль на стол)

Рака нараджаецца з ручаёў, дрэва расце з каранёў, чалавечая годнасць і вартасць нараджаецца з глыбокай адданасці Радзіме, з ведання яе гісторыі, культуры.

Давайце зараз зазірнем у хату да дзядзькі Цярэшкі і цёткі Васіліны.

(Стаіць упрыгожаная хата, сядзіць гаспадыня, вышывае сурвэтку, гаспадар стругае нешта, Васіліна спявае. Раздаецца грукат у дзверы.)

Васіліна

Цярэшка, ці не толькі прыйшлі да нас дзяўчаты, сёння ж у нашай хаце вячоркі.

Цярэшка

Ну калі так, дык трэба гасцей сустракаць, пайду дзверы адчыню.

(Адчыняе дзверы, у хату ўваходзяць госці і спяваюць.)

Госці

На вячоркі мы ідзём,

Дарагія дзевачкі,

Гарманіст у нас харошы

Грае нам прыпевачкі.

Васіліна

Добры вечар, дзяўчынкі – весялінкі!

Уваходзьце, калі ласка!

Цярэшка

Ой, сябры! Вітаем вас!

Уваходзьце, хуценька да нас!

Сёння наша хата

Весялосцю багата!

Дзяўчына

8 кл.Паглядзіце, як прыгожа прыбрана хата ў цёткі Васіліны!

(Дзяўчаты разглядваюць хату, а Васіліна паказвае, што ў яе хаце ёсць.)

Васіліна

А я сёння рана ўстала,

Ручнік гладдзю вышывала.

Вось які ён у мяне прыгожы атрымаўся.

А гэта вось сатканы абрус з узорамі,

Каб стол быў засланы святочным уборам.

А вось ляжыць палавік паласаты,

Гэта ўбор вясковай хаты.

А цяпер, любыя госці,

Просім у вас мілосці,

Каб вы так не сядзелі,

А ў руках справу імелі.

Сядайце, калі ласка.

(Усе сядаюць і хто пляце, хто вышывае, хто кудзелю прадзе, хто клубкі пераматвае. Усе працуюць і размаўляюць паміж сабой.)

**Дзяўчына Ліза**

А мы лён ірвалі,

У снапы вязалі,

Аббівалі, у полі слалі.

Урадзіўся ў нас лянок,

Белы, слаўны кужалёк.

**Дзяўчына Каця**

І  мы многа працавалі,

Сеялі, палолі, рвалі,

Пражу пралі,

Кросны ткалі.

Выйшлі посцілкі на славу,

Хоць на ложак, хоць на лаву.

**Васіліна**

Вось, якія чараўніцы,

Вось, якія ўсе майстрыцы,

Возьмуць у рукі палатно –

Ажывае ў іх яно.

Каб было лепш працаваць,

Трэба песню заспяваць.

(Працуюць і спяваюць песню “Ох,і сеяла Ульяніца Лянок”. )

У гэты час унучка Кацярынка дастае з бабулінага куфра і паказвае сваім сяброўкам ручнік.

**Васіліна**

І хто ж гэта вам дазволіў адкрываць мой куфар?

**Кацярынка** .Ой, выбачай, бабулечка! Я вырашыла паказаць сваім сяброўкам твой прыгожы вясельны куфар і ручнік.

Васіліна. ( задаволена) ). Ой, так, мае дзеткі. Гэта сапраўды мой вясельны ручнічок, падножнікам называецца. Калі я была яшчэ маладая (цяжка ўздыхае) і выходзіла замуж за вашага дзеда , то ў час вянчання ў царкве мы з ім стаялі на гэтым белым і даўгім ручніку. Перад Богам і людзьмі кляліся навечна адзін аднаму ў вернасці і каханні.

уціральнік і выцірае аб яго рукі.

Бабуля, а чаму ён такі доўгі і белы?

Бабуля. Доўгі і белы чаму? Відаць, таму ён доўгі, мае дзеткі, каб я з вашым дзедам шмат гадоў, аж да самае смерці, у пары жыла. А белы? (Задумаўшыся.) Напэўна, каб мы былі сумленнымі, давяралі адно аднаму, былі чыстымі ў думках і справах сваіх.

**Кацярынка.** Бабулечка, а я  ведаю пра гэтыя дзіўныя ўзоры на ім чорныя крыжыкі – гэта, відаць, наша зямля, глеба, куды кідаюць зерне ў час сяўбы. А чырвоныя – гэта, няйнакш, зярняткі і сонца, што даюць цяпло і жыццё ўсяму жывому. (Праз невялікую паўзу) А можа, гэта яшчэ і радасць, і сум. Не заўсёды ж ў людзей вяселле бывае, прыходзіць і бяда.  Сапраўдны ручнік-гэта не проста кавалак тканіны, якім выціраюць твар і рукі. На Беларусі шмат звычаяў, звязаных з выкарыстаннем ручнікоў. На ручніку падносяць хлеб-соль. Калі вітаюць дарагіх гасцей. Таму  што  ручнік—гэта сімвал чысціні, цяпла беларускай зямлі і роднай хаты

**Кац.1-ая дзяўчына.** Слухайце,  дзяўчаты, давайце пагадаем, ці пойдзе хто з нас замуж.

**Ліза 2-ая**.Як гэта, я і не ведаю.

**Дзевятая Насця. 8 кл .3-ая** Каб даведацца, быць ці не быць новай сям'і, гадаюць на сцяблінках высушанага льну. Трэба ўзяць дзве сцяблінкі высушанага льну, кінуць іх угару. Калі яны пераблытаюцца між сабой-павяжуць рукі маладых вясельным ручнікам. Калі не—сядзець у дзеўках яшчэ год.

(дзяўчаты гадаюць)

**8 кл. Саша 4-ая** (пасля невялікай паўзы). А хочаце, я вам таксама раскажу, як лён дзяўчыну выратаваў? (Усе згаджаюцца.)

У адным сяле жыла прыгожая дзяўчына і хацела яна выйсці замуж за багатага, але ніхто не сватаўся да беднай. І вось аднойчы да гэтай дзяўчыны прыехаў багаты пан на вараных конях. Ён быў прыхожа апрануты – увесь ў золаце. І гаворыць: "Што, спадабаўся я табе, Алеся?" Дзяўчына пачырванела і кіўнула галавой. І насыпаў ей малады паніч золата поўны куфар, а дзяўчына не бачыла, што гэта не золата, а вуголле. Тады яны селі на коней і паехалі да яго ў палац. Коні ляцелі, як быццам ў іх сядзела нячыстая сіла. І толькі цяпер дзяўчына ўбачыла пад сурдутам у маладога пана хвост. І здагадалася яна, што гэта не пан, а чорт. (Дзве-тры дзяўчынкі войкнулі.)

Тады выскачыла яна з карэты і схавалася ў лёне. А чорт і кажа: "Лён, лён, аддай дзяўчыну". А лён падумаў, і стала яму шкада гэтай дзяўчыны, і гаворыць ён, што аддасць яе пасля таго, як раскажа ўсю сваю біяграфію. І стаў лён расказваць, як яго рвалі і складвалі ў кучкі, потым вазілі на ток і абівалі, як яго пасля часалі і мялі, як з яго кужалю пралі ніткі, як ткалі, як палотны адбельвалі, як вопратку з палотнаў шылі і што носяць яе мужыкі бедныя.

І пакуль лён расказваў сваю біяграфію, ужо заспявалі трэція пеўні, і чорт знік. Пасля таго выпадку дзяўчына больш не шукала багатага пана, каб выйсці замуж. Вось як было. (Усе з палёгкаю ўздыхнулі.)

Пры слове "чорт" за кулісамі нечакана чуецца топанне ног і звон перакінутых вёдзер. Усе дзяўчынкі з віскам і шумам хаваюцца: хто – пад стол, хто – пад лавы, а некаторыя туляцца да Васіліны.

У хату ўваходзяць тры-чатыры хлопчыкі.

**Усе яны разам.** Добры вечар у хату!

**Васілёк.** Добры вечар, усім! А дзяўчат ужо і дух заняло: ні жывыя, ні мёртвыя. Эй, вылазьце. Баязліўкі! (Нагінаецца і глядзіць пад стол і лаўкі. Хлопцы таксама нагінаюцца і смяюцца.) Гэта ж Андрэй-верабей з намі прыйшоў.

(Дзяўчынкі незадаволена вылазяць са сваіх сховішчаў, асобныя з іх штурхаюць хлопцаў у спіны, плечы. Усе сядаюць на лавы.)

**Саша.** А мы тут, хлопчыкі, розныя страхі расказваем. Праз тое і напалохаліся. Сэрца і зараз яшчэ не супакоілася.

(У хату ўваходзяць хлопцы.)

**Мікіта** Як павялося пры сустрэчы

Вітаем шчыра: добры вечар!

**Васіліна**

Добры вечар, хлопчыкі – малойчыкі!

Мілосці просім да нас у госці!

Вячоркі чакаюць гасцей,

Уваходзьце ў хату хутчэй!

Сядайце, далучайцеся да працы.

*Хлопцы ставяць мех*

**Лера.** Можа, пажартаваць, пазагадваць загадкі, пачаставаць арэхамі нас прыйшлі.

*Каця падыходзіць да мяха і заглядвае, адтул вылазіць хлопец, пераапрануты ў чорта.Усе дзеўкі зноў пішчаць.*

**Антон Хлопчык**. А што , давайце я вам адну загадку раскажу, якую мне сёння мой бацька загадаў. Хочаце ці не? (Усе згаджаюцца. )Ну, дык уважліва слухайце: па саломе ідзе, не шастае, па вадзе ідзе, не плюхае. (Сонца і цень.) А паслухайце тады яшчэ адну: пакуль бацька нарадзіўся, сын па свеце нахадзіўся. (Агонь і дым.)

**2-гі хлопчык.** А вось мая загадка: вырас лес белы ўвесь, ні заўсці ў яго, ні паехаць. (Малюнкі марозу на вокнах.) Што не мае даўжыні, глыбіні, шырыні, вышыні, а мерацъ яго можна. ( Час).

**Дзяўчынка.** Ой, ….., досыць табе загадваць. Давайце лепш у што-небудзь пагуляем.

**Усе** (згаджаюцца з гэтай прапановай і ўскокваюць з лавак). Давайце! Давайце! Толькі ў што?

Гульня

( пасля гульні усе працуюць, гучыць музыка.)

Антон **.** А хочаце паслухаць анекдот, які мне сёння мой бацька расказаў. (Усе зноў зацікавіліся.) Ну дык слухайце.

Школьны інспектар, едучы праз вёску, запытаўся ў хлопца-школьніка дарогу да школы. Той дарогу паказаў. На другі дзень інспектар выклікаў яго ў школе да карты і запытаўся, як вядзе дарога ў Варшаву. Хлопец доўга глядзеў на карту і нарэшце сказаў: “Вы не ведаеце дарогі ў школу, а хочаце, каб я ведаў дарогу ў Варшаву”. (Усе дзеці смяюцца.)

Васіліна

Цярэшка, што ты маўчыш, як вады ў рот набраўшы, раскажы што-небудзь цікавае.

Цярэшка

Зараз, сэрца залатое.

Колісь баба і дзед жылі,

Куры, гусі ў іх былі,

Парасяты і бычкі,

Добра жылі старычкі…

Пабачце, вось лёгкія на ўспамін, да нас завіталі.

**(Уваходзяць у хату баба і дзед спрачаючыся.)**

Баба

Я табе кажу не прадам.

Дзед

А я табе кажу прадасі.

Баба

Не прадам.

Дзед

Прадасі.

Васіліна

Пачакайце, пачакайце, а што гэта ў вас за спрэчка?

Дзед

Вось хвалёна гаспадыня мая,

Мне не мытую сарочку дала,

Не мытую, не качаную,

У суседа пазычаную.

Баба

А ты што, лепшы за мяне, такога бычка хоча збыць!

Дзед

Ды забярыце вы і кароўку,

Свабадзіце ёй галоўку,

Бо няўмее ні кароўку даіць,

Бо няўмее ні цадзілку памыць,

Толькі умее па вяселлях хадзіць.

Васіліна

Хопіць вам спрачацца, кажуць вы вельмі прыгожа спяваць умееце, паспявайце лепш, а мы паслухаем.

Баба Спяваць мы вельмі любім, давай паспяваем.**(Песня "Сабірайся ў госці, мой дзядок":)**

Сабірайся ў госці, мой дзядок,

Сабірайся ў госці, галубок.

Не пайду я ў госці, холад на двары

А м не ломіць косці, я ужо стары.

Сабірайся ў госці, мой дзядок,

Сабірайся ў госці, галубок.

Не пайду я ў госці, я ж табе кажу,

Лепш на цёплай печы трошкі паляжу.

Як не пойдзеш у госці, грошай дай.

Трэба мне занесці каравай.

Бяры сабе грошы, ці мне іх шкада,

Толькі адчапіся ад мяне, бяда.

Дык ляжы на печы, стары дзед,

А мяне ў госці павядзе сусед.

Пачакай, гагулька, не спяшай.

Пойдзем разам у госці, мяне не пакідай.

Цярэшка

А давайце я вашага бычка куплю.

Баба

А колькі грошай ты мне за яго дасі?

Цярэшка

Торбу грошай на ўдачу,

Ды яшчэ мяне ў прыдачу.

Баба

Ну калі так, я згодна.

Торбу грошай на ўдачу

Ды Цярэшку ў прыдачу.

Цяпер пойдзеш ты, дзядок

З бычком разам у хлявок.

Васіліна

Ну, хопіць жартаваць, я свайго Цярэшку не прадаю, мне ў гаспадарцы і самой ён патрэбны, сядайце лепей, далучайцеся да нас.

**Ліза Дзяўчынка**

Ой, дзяўчаткі, паглядзіце, Юрасік ідзе, давайце яго паклічам да нас!

(Выбягаюць, пад рукі прыводзяць Юрасіка)

**Ліза** Гэй ты, Юрачка,

Выхадзі да нас,

Бяры дзевачак,

Ды пускайся ў пляс.

Юрасік

Я б пайшоў скакаць,

Ручанькі баляць,

Ножанькі баляць,

Лепш пайду я спаць.

Дзяўчынкі( Каця)

Гэй ты, Юрачка, Выйдзь на ганачак,

Мы дадзім табе

Вязку абараначак

Юрасік

Выйду я на ганачак,    Дзе ваш абараначак?

(Дзяўчынка вешае вязку абараначак Юрасіку на шыю.)

Юрасік

Вось цяпер пайду скакаць

Покуль грае скрыпка,

Ручкі, ножкі не баляць,

Сярэдзінка гібка!

Васіліна

-Цяпер, хлопцы, не зявайце,

Дзяўчат у гурце выбірайце!

**Юрасік з Лізай**

Зараз буду выбіраць

З кім мне лепей у пару стаць.

А я з той пайду скакаць,

Што ўмее вышываць

Хлопчык ( Лера) Алеша

А я вазьму тую,

Што добра танцуе

А  яшчэ трэба тая,

Што добра спявае.

**Хлопчык Антон**

А мне да спадобы тая,

Што каса тугая.

**Хлопчык Мікіта з Кацяй**

А я з той пайду скакаць,

Што ўмее гатаваць.

Юрасік

Гэй, музыка, зайграй,

Жару, пылу паддавай,

Зробім круг вялікі,

Скачуць чаравікі!

Цярэшка

Зайграйце, музыкі,

У мяне лапці вялікі.

Мне бацька іх сплёў

На вялікі Пакроў.

(Выконваецца танец “Полька”. )

Васіліна

Ой, госцейкі мае даражэнькія, я вас чакала ды пірог пякла, а гаспадар квасу нарабіў. Цярэшка, ідзі квас нясі.

(Цярэшка ідзе за квасам, а Васіліна раздае пірог і расказвае.)

Сёння мы вячоркі святкуем,

Усіх гасцей пірагом частуем,

І Андрэя, і Сашу, і Колю –

Наядайцеся ў волю.

Не ўсё ж спяваць, ды танцаваць. Кажуць так: “Будзе хлеб – будзе і песня”. І сапраўды красна хата не вугламі, а пірагамі. Цярэшка, дзе  ты, хутчэй квас нясі.

Цярэшка

(Нясе збан з квасам і прыгаварвае.)

Чыжык – пыжык,

Дзе ты быў?

На вячорках квас піў.

Выпіў квасу кроплі дзве -

Зашумела у галаве!

Вось Сярожу ды Івана

Напаю з гэтага збана.

Ну а вы, падружкі,

Падстаўляйце кружкі.

(Налівае квас.)

Дзяўчынка

Лера . Цярэшка, які у цябе смачны квас, як ты яго рабіў, можа рацэпт дасі?

Цярэшка

А гэта зусім проста. Бярэш вядро вады, тры літры мёду, пуд солі, бутэльку воцату, перамешваеш усё і ставіш на паўгода на печ у цёплае месца, вось табе і квас.

Васіліна

Што ты мелеш, такім квасам атруціцца можна.

Баба Алена

Дзякуй за смачны пірог ды цудоўны квас, але ужо позна, пара дамоў збірацца. Нагуляліся самі, людзей павесялілі дый работу зрабілі. Заўтра рана уставаць, ісці працаваць, бо без працы няма чаго хлеба шукаці.

Васіліна

Дзякуй і вам , хлопцы-малойцы ды дзяўчаткі- кветачкі, што завіталі да мяне на вячоркі.

Каця Госці. Няхай вам часценька шанцуе на госці,

Ніхто каб ніколі не меў на вас злосці.

Давайце заспяваем напаследак.

(Выконваюць песню “Бывайце даровы, жывіце багата”)

(Пад музыку песні выходзяць.)

Вядучая

Вось і скончылася наша падарожжа ў мінулае. Мы сустрэліся з добрымі, ветлівымі людзьмі, якія ўмеюць не толькі працаваць, але і адпачываць. Настала пара і нам з вамі развітвацца. Жывіце ў згодзе і радасці, вучыцеся ў нашых продкау мудрасці, помніце іх запаветы, бо без памяці няма сумлення. Бывайце здаровы. Да новых сустрэч!

Несцерка:

-- Добры дзень у хату!

Шчыра ўсіх вітаю,

Добрага здароўя ўсім жадаю!

Ці можна да вас на вячоркі?

Ганна:

--Заходзь, хлопча, мы гасцям рады. У нас тут вячоркі ў поўным разгары. Ты чый будзеш, адкуль ідзеш, што добрага ў мяху нясеш?

Несцерка:

-- Я , гаспадынька, Несцерка. Іду да вас са Спачынку. Аб'ехаў увесь свет, вырашыў заехаць да вас на хвілінку. Сябе паказаць, людзей паглядзець.

Ганна:

-Дык заходзь, сядай, з намі заспявай.

Несцерка:

--Гляджу ў вас у вёсцы гарныя дзеўкі, можа заспяваюць для мяне прыпеўкі?

Дзяўчына:

Чаму ж не заспяваць!

Давайце, дзяўчаты, няма чаго на лаўках сядзець ды носам кляваць.!

-5-

1.На вячоркі мы прыйшлі,

Дарагія дзевачкі,

Несцерцы цяпер спяём

Нашыя прыпевачкі.

2.Мы прыпеўкі заспяваем,

Каб смяяліся ўвесь час.

Калі мы вам даспадобы,

Запрашаем усіх да нас.!

3. Ці я ў мамкі не дачка,

Ці я не дачушка.

Хоць малая я расточкам,

Але ж весялушка.

4. Чаму мілы не прыйшоў?

Ці штаны ты не знайшоў?

Хоць бы дзедавы надзеў,

Дзед на печы б пасядзеў!

5. Не дай Божа з такім лёсам –

Любіць хлопца з доўгім носам.

Каб яго пацалаваць,

Трэба нос адпілаваць.

Несцерка:

-- Добра дзяўчаткі прыпеўкі спяваюць. Але ж гляджу ў вас у хаце дзяцей малых цэлыя палаці. Трэба іх павесяліць. Хто з вас умее скарагаворкі гаварыць? Ідзіце да мяне, хто лепш за ўсіх скарагаворку скажа, таму і ўся павага наша. А ад мяне яшчэ і цукерка.

(дзеці па аднаму чытаюць скарагаворкі)

1.Мама-мышка сушыла шышкі

2. Скрып-скрып, скрып-скрып!

Снег ад холаду ахрып!

3.Пілiпаў Піліп прыпоўз да ліп і да лаўкі прыліп.

-4.Масла пагасла, сала патала, а каўбасе ліха стала.

5. У бубіны бубнілі, бубнілі, панабубніваліся.

6. Жабрак жабрака жабраваць вучыць.

7. Гаварыў, гаварыў, не дагаварыў ды загаварыўся.

8. Пісаў пісака, пісаў перапісваў, ды так і не напісаў.

9. Як чарніцы не дурніцы, так дурніцы не чарніцы.

10.Бульба з булкай білiся, білся, бульба булцы дала, булка сплюшчылася.

Несцерка:

--Ух якія ўдалыя! Добра ж гаварыць умееце! Ну цяпер цукеркі атрымайце, ды на месцы свае сядайце.

Несцерка:

--Добра ў вас, гаспадынька! Цікава ды весела. Трэба яшчэ ногі размяць – у гульню якую пагуляць.

(Гульня)